УДК 330.858

*В. Гісторыя эканамічнай думкі, метадалогія і неартадаксальныя падыходы*
*B. History of Economics Thought, Methodology and Heterodox Approaches*

# ЭКАНАМІЧНАЯ АДУКАЦЫЯ І НАВУКА Ў БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ (ДА 100-ГОДДЗЯ ЎНІВЕРСІТЭТА)

***М. М. КАВАЛЁЎ***[1*]***, Г. А. КАРАЛЁВА***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Вывучаецца гісторыя станаўлення эканамічнай адукацыі і навукі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Вызначаецца роля вучоных універсітэта ў развіцці айчыннай эканамічнай навукі, а таксама іх унёсак у эканамічную палітыку і практыку Рэспублікі Беларусь.

***Ключавыя словы:*** гісторыя эканамічнай навукі; гісторыя БДУ; выбітныя навукоўцы-эканамісты.

# ЭКОНОМИЧЕСКОЕ ОБРАЗОВАНИЕ И НАУКА В БЕЛОРУССКОМ ГОСУДАРСТВЕННОМ УНИВЕРСИТЕТЕ (К 100-ЛЕТИЮ УНИВЕРСИТЕТА)

***М. М. КОВАЛЁВ***[1)]***, А. А. КОРОЛЁВА***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Изучается история становления экономического образования и науки в Белорусском государственном университете. Определяется роль ученых университета в развитии отечественной экономической науки, а также их вклад в экономическую политику и практику Республики Беларусь.

***Ключевые слова:*** история экономической науки; история БГУ; выдающиеся ученые-экономисты.

**Образец цитирования:**
Кавалёў ММ, Каралёва ГА. Эканамічная адукацыя і навука ў Беларускім дзяржаўным універсітэце (да 100-годдзя ўніверсітэта). *Журнал Белорусского государственного университета. Экономика*. 2021;2:4–17.

**For citation:**
Kovalev MM, Koroleva AA. Economic education and science at the Belarusian State University (to the 100th anniversary of the university). *Journal of the Belarusian State University. Economics.* 2021;2:4–17. Belarusian.

**Авторы:**
***Михаил Михайлович Ковалёв*** – доктор физико-математических наук, профессор; профессор кафедры аналитической экономики и эконометрики экономического факультета.
***Анна Анатольевна Королёва*** – кандидат физико-математических наук, доцент; декан экономического факультета.

**Authors:**
***Mikhail M. Kovalev***, doctor of science (physics and mathematics), full professor; professor at the department of analytical economics and econometrics, faculty of economics.
*kovalev@bsu.by*
***Anna A. Koroleva***, PhD (physics and mathematics), docent; dean of the faculty of economics.
*koroleva@bsu.by*



CC BY NC

# ECONOMIC EDUCATION AND SCIENCE AT THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY (TO THE 100th ANNIVERSARY OF THE UNIVERSITY)

***M. M. KOVALEV*[a], *A. A. KOROLEVA*[a]**

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*
*Corresponding author: M. M. Kovalev (kovalev@bsu.by)*

The article studies the history of the formation of economic education and science at the Belarusian State University until its centenary. The contribution of university scientists to the development of Belarusian economics is highlighted, as well as their contribution to the economic policy and practice of the Republic of Belarus.

***Keywords:*** history of economics; history of the Belarusian State University; outstanding scientists-economists.

## Эканамічная адукацыя і навука ў БДУ ў перыяд НЭПа

Падрыхтоўка эканамістаў у Беларускім дзяржаўным універсітэце (БДУ) вядзецца з моманту яго заснавання ў 1921 г. Новая эканамічная палітыка (НЭП) спрыяла росту попыту на спецыялістаў з эканамічнай і іншай вышэйшай адукацыяй. Гэта стала адной з прычын стварэння ўніверсітэта. У склад камісіі па арганізацыі БДУ ўваходзілі вядомыя гісторыкі эканомікі У. В. Пічэта, М. В. Доўнар-Запольскі, спецыяліст у эканамічнай геаграфіі А. А. Смоліч. Сімвалічна тое, што дыплом № 1 у БДУ быў уручаны менавіта выпускніку эканамічнага аддзялення факультэта грамадскіх навук 20 лютага 1925 г.: У. М. Каракулька абараніў дыпломную працу «Нажніцы: фабрычна-заводская прамысловасць і сельская гаспадарка», апанентамі выступалі рэктар У. І. Пічэта і дацэнт І. Я. Герцык.

У першыя гады існавання БДУ падрыхтоўка эканамістаў ажыццяўлялася на эканамічным аддзяленні факультэта грамадскіх навук, на базе якога восенню 1925 г. быў створаны факультэт гаспадаркі і права. У сваю чаргу, у 1929 г. з яго быў вылучаны факультэт народнай гаспадаркі, дзе працавалі чатыры аддзяленні: адміністратыўна-прамысловае, кааператыўнае, планава-статыстычнае і фінансавае.

Арганізатарам эканамічнай адукацыі ў БДУ быў сам рэктар У. І. Пічэта. Ён узначальваў камісію па эканамічнай адукацыі, якая распрацоўвала і зацвярджала вучэбныя планы і падбірала лектараў. Рэктару ўдалося прыцягнуць ва ўніверсітэт для чытання лекцый такіх вядомых навукоўцаў, як У. М. Ігнатоўскі, Л. І. Лубны-Герцык, А. А. Манаў, М. Б. Гольман, І. В. Герчыкаў, І. Я. Герцык, М. М. Краўчанка, А. А. Смоліч, А. І. Шэйнін, В. В. Якунін і інш.

Асноўны курс «Гісторыя народнай гаспадаркі Беларусі» чытаў сам У. І. Пічэта, абапіраючыся на ўласныя кнігі [1–4].

Дзевяць год навуковай кар’еры У. І. Пічэты ў Беларусі можна лічыць самымі прадуктыўнымі – ён істотна прасунуў вывучэнне гісторыі развіцця гаспадаркі беларускіх зямель і па праву можа лічыцца адным з заснавальнікаў эканамічнай гісторыі Беларусі. У. І. Пічэта адным з першых пачаў вывучаць Літоўскую метрыку.

Эфектыўную адукацыйную і навуковую дзейнасць рэктар спалучаў з прапагандысцкай: толькі за 1922/23 навучальны год ім было прачытана сем навукова-папулярных лекцый.

Не менш напружана працавалі і іншыя вучоныя-эканамісты.

Прафесар Л. І. Лубны-Герцык чытаў у БДУ курсы па статыстыцы і палітэканоміі, пісаў навуковыя артыкулы па аграрным перанасяленні, працаёмкасці земляробства, а таксама выступаў з дакладамі.

Прафесар В. В. Якунін вёў шэраг дысцыплін па фінансах і рахункавядзенні.

Значная вучэбная нагрузка на эканамічным аддзяленні БДУ ляжала на дацэнце І. Я. Герцыку, ураджэнцу Магілёўшчыны, які чытаў лекцыі па палітэканоміі і гісторыі эканамічных вучэнняў, грашовым абарачэнні, тэхніцы банкаўскай справы. Ён зрабіў значны ўнёсак у даследванне буржуазных эканамічных вучэнняў ад Д. Рыкарда да сучасных яму аўстрыйскіх эканамістаў.

Знакаміты беларускі гісторык і эканаміст М. В. Доўнар-Запольскі з 1925 па 1926 г. працаваў у БДУ і адначасова з’яўляўся членам эканамічнай секцыі Дзяржплана БССР. У 1926 г. у Дзяржплане БССР ён выдаў кнігу «Народная гаспадарка Беларусі» [5], якая ўтрымлівала вялікую колькасць статыстычных даных (што выклікае цікавасць да яе і па сённяшні дзень), а таксама падрыхтаваў забароненае ў той час як ідэйна-варожае і надрукаванае толькі ў 1994 г. выданне «Гісторыя Беларусі», якое ў пэўным сэнсе з’яўляецца крыніцай па гісторыі эканамічнага развіцця беларускіх зямель.

Нягледзячы на адносна слабую агульную падрыхтоўку студэнтаў-эканамістаў на дастаткова высокім ўзроўні дацэнтам І. С. Пятосіным выкладалася вышэйшая матэматыка.

Першыя выкладчыкі-эканамісты БДУ актыўна ўдзельнічалі ў вырашэнні гаспадарчых задач краіны: І. Я. Герцык з'яўляўся членам прэзідыума Дзяржплана БССР, А. І. Шэйнін узначальваў у Дзяржплане БССР кан'юктурнае бюро і з'яўляўся сааўтарам кантрольных планавых лічбаў БССР на 1926 г. Навукоўцы-эканамісты БДУ актыўна вялі дыскусіі па палітэканоміі сацыялізму і закладалі яе тэарэтычныя асновы ў сферах вытворчых сіл і зносін, эканамічных зносін пралетарыята і сялянства, паняцця сацыялістычнай уласнасці. Важна адзначыць, што дыскусіі, навуковыя спрэчкі былі звыклым стылем навуковай работы таго часу, і толькі ў 1930-я гг. яны ператварыліся ў даносы, на аснове якіх НКУС пачынаў свае справы.

Яшчэ адной адметнай рысай эканамічнай навукі і адукацыі ў першыя гады існавання БДУ стала імкненне быць на міжнародным узроўні, удзельнічаць у эканамічных дыскусіях і міжнародных канферэнцыях. Так, рэктар У. І. Пічэта па некалькі разоў на год выязджаў у Германію, Літву, Чэхію, Нарвегію, Польшчу і іншыя краіны. Многія навукоўцы-эканамісты, акрамя БДУ, чыталі лекцыі ў маскоўскіх вышэйшых навучальных установах. Іншымі словамі, нават у цяжкіх умовах ізаляцыі СССР навукоўцы падтрымлівалі замежныя кантакты.

Асаблівасцю эканамічнай адукацыі таго часу можна лічыць практычную і аналітычную скіраванасць навуковых даследаванняў па актуальных праблемах развіцця беларускай эканомікі. З мэтай практычнай падрыхтоўкі студэнтаў ствараліся кабінеты статыстыкі, тавараназнаўства, лесаэкономікі і лясной статыстыкі, праводзіліся дзясяткі практычных і лабараторных семінараў на адміністратыўна-прамысловым і банкаўска-фінансавым аддзяленнях. З 1925 г. да іх далучыліся кааператыўнае і планава-статыстычнае аддзяленні.

Чытаць лекцыі запрашалі кіраўнікоў краіны, напрыклад, сакратар ЦК КП(б)Б В. Г. Кнорын у 1923 г. вёў курс «Эканоміка пераходнага перыяду ў сувязі з арганізацыяй вытворчасці». Навукоўцы-эканамісты садзейнічалі прыняццю правільных гаспадарчых рашэнняў у гады НЭПа. Пры абгрунтаванні арыгінальнай у СССР беларускай аграрнай палітыкі перыяда НЭПа наркам земляробства таго часу Д. А. Прышчэпа абапіраўся на працы У. І. Пічэты [4], М. В. Доўнар-Запольскага [5], А. А. Смоліча [6] і іншых, а таксама часта раіўся з навукоўцамі БДУ.

Такім чынам, можна вылучыць пять характэрных рыс першага дзесяцігоддзя эканамічнай адукацыі і навукі ў БДУ (1921–1931 гг.):

- аналітычнасць, якая запяспечвалася высокім узроўнем матэматычнай падрыхтоўкі, і практычнасць (цесная сувязь з патрэбай краіны, у прыватнасці, для гэтага адкрываліся кароткачасовыя курсы павышэння кваліфікацыі);
- супрацоўніцтва з уладамі (удзел навукоўцаў-эканамістаў у выпрацоўцы эканамічнай палітыкі краіны, у тым ліку ў форме працы ў эканамічных органах);
- актуальнасць і прадуктыўнасць навуковых даследаванняў (значная колькасць публікацый у кожнага прафесара і дацэнта штогод) па сучасных праблемах;
- папулярызацыя эканамічных ведаў (пастаянныя выступленні вучоных для розных аўдыторый);
- міжнародны ўзровень даследванняў і навучання, якому не замінала ізаляцыя СССР і асобы пралетарскі падыход у навуцы.

Адным словам, у разглядаемы перыяд ва ўсім універсітэце сфарміраваўся асаблівы дух, які дапамагаў выкладчыкам і выпускнікам спрыяць бурнаму развіццю эканомікі БССР. У той час НЭП патрабаваў падрыхтоўкі кваліфікаваных эканамічных кадраў і БДУ выпусціў іх больш за 300.

У перыяд другой пяцігодкі (1933–1937), час пралікаў і «шкоднікаў», эканамістаў у БДУ ўжо не рыхтавалі. Справа у тым, што ў 1931 г. у выніку разбуйнення ўніверсітэта на базе факультэта народнай гаспадаркі з 700 студэнтамі былі створаны тры вышэйшыя навучальныя ўстановы: Планава-эканамічны інстытут, Фінансава-эканамічны інстытут, Інстытут спажывецкай кааперацыі, якія ўжо ў 1933 г. былі аб'яднаны ў Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі (БДІНГ, зараз – БДЭУ). Першым дырэктарам БДІНГ быў прызначаны дэкан факультэта народнай гаспадаркі БДУ А. В. Гурло – выпускнік універсітэта 1931 г. Адзначым, што і наступныя дырэктары БДІНГ (І. Л. Сацуковіч, Я. Н. Рамашка) таксама былі выпускнікамі БДУ. І ў цэлым асноўны касцяк выкладчыкаў БДІНГ складалі выкладчыкі і выпускнікі БДУ.

## Перыяд выкладання палітычнай эканоміі сацыялізму і капіталізму

З 1933 г. выкладчыкі-эканамісты (М. С. Башкевіч, Н. Ф. Пракапенка, П. Е. Сацько) забяспечвалі выкладанне палітычнай эканоміі (120 гадзін) на ўсіх факультэтах БДУ. Гэты курс быў адной з трох састаўных частак тэорыі марксізму-ленінізму, а ў 1936 г. пастанаўленнем ЦК ВКП(б) яго падзялілі на два напрамкі: палітычную эканомію сацыялізму і палітычную эканомію капіталізму, якія выкладаліся ў БДУ аж да атрымання Рэспублікай Беларусь незалежнасці.

Выкладчыкі палітычнай эканоміі працавалі ў асноўным на кафедры грамадскіх навук БДУ, а ў канцы 1930-х гг. – на кафедры марксізму-ленінізму. Кафедра палітычнай эканоміі была створана толькі ў пачатку верасня 1940 г. у парадку выканання загада Камітэта па справах вышэйшай школы пры СНК СССР ад 8 чэрвеня 1940 г. Упершыню наяўнасць кафедры палітычнай эканоміі згадваецца ў загадзе па БДУ ад 9 верасня 1940 г. № 160. Першым загадчыкам гэтай кафедры быў прызначаны прафесар А. І. Лур'е (працаваў у БДУ ў 1929–1932 і 1938–1948 гг.).

Вайна прыпыніла навучальны працэс ва ўніверсітэце. Ен аднавіўся толькі ў 1943 г. у будынку школы на станцыі «Сходня» каля Масквы і ў лабараторыях МДУ імя М. В. Ламаносава. Прафесар А. І. Лур'е адзін забяспечваў выкладанне палітычнай эканоміі ў БДУ. Новы, 1944/45, навучальны год універсітэт распачаў ужо ў вызваленым Мінску.

У лютым 1944 г. на кафедру палітычнай эканоміі прыйшоў працаваць дацэнт А. П. Скуман. З 1 снежня 1946 г. на пасаду рэктара БДУ быў прызначаны эканаміст У. А. Тамашэвіч, які стаў таксама дацэнтам кафедры палітычнай эканоміі.

28 снежня 1946 г. падчас пасяджэння кафедры палітычнай эканоміі па ініцыятыве А. І. Лур'е і У. А. Тамашэвіча было прынята рашэнне прасіць рэктарат паставіць праз вучоны савет універсітэта пытанне перад Міністэрствам вышэйшай адукацыі СССР аб дазволе БДУ прымаць да абароны кандыдацкія дысертацыі па эканамічных навуках. Напачатку 1948 г. такое права БДУ было дадзена. Прафесар А. І. Лур'е і дацэнт У. А. Тамашэвіч шмат зрабілі для падрыхтоўкі кандыдатаў эканамічных навук, многія з якіх потым паспяхова абаранілі доктарскія дысертацыі. Трэба адзначыць, што ў пасляваенны час на геаграфічным факультэце БДУ актыўна працавала кафедра эканамічнай геаграфіі (загадчык М. Я. Рагозін з 1948 г.).

Пасля смерці прафесара А. І. Лур'е ў 1948 г. кафедру палітычнай эканоміі ўзначаліў рэктар, дацэнт У. А. Тамашэвіч, які з 1949 г. стаў сакратаром ЦК КПБ, адначасова працягваючы да 1969 г. выконваць абавязкі загадчыка кафедры. У 1948 г. старшы выкладчык кафедры палітычнай эканоміі З. З. Дудзіч першым з аспірантаў-эканамістаў абараніў кандыдацкую дысертацыю «Сацыялістычныя формы арганізацыі і аплаты працы ў калгасах», а ў 1953 г. кандыдацкую дысертацыю абараніў і загадчык кафедры У. А. Тамашэвіч. Выкладчыкамі кафедры палітычнай эканоміі і яе аспірантамі быў апублікаваны шэраг навуковых артыкулаў у беларускіх газетах і часопісах, а таксама серыя невялікіх манаграфій.

У. А. Тамашэвіч у 1956 г. абараніў у Маскве доктарскую дысертацыю «Сацыялістычная індустрыялізацыя БССР». Развіваючы гэту тэму, ён у далейшым падрыхтаваў каля 10 кандыдатаў эканамічных навук. Навуковы напрамак яго школы быў цесна звязаны з абгрунтаваннем прамысловай палітыкі БССР.

Навуковая праца кафедры палітычнай эканоміі ў 1960-я гг. была арыентавана на забеспячэнне дапамогі сацыялістычнай прамысловасці і сельскай гаспадарцы ў вырашэнні эканамічных праблем таго перыяду. Касцяк кафедры складалі дацэнты А. П. Скуман, Ц. А. Базылеў, С. Я. Янчанка, У. В. Цакуноў, І. Т. Рагоўскі, І. К. Караленка, П. У. Грышановіч, старэйшыя выкладчыкі І. Ц. Васілеўскі, А. Я. Бураўскі і інш. З 1945 па 1960 г. у аспірантуры на кафедры палітычнай эканоміі навучаліся 23 выкладчыкі, 14 з якіх абаранілі кандыдацкія дысертацыі.

Асабліва спрыяльнымі для развіцця кафедры палітычнай эканоміі былі 1960-я гг. Пасля заканчэння аспірантуры працаваць на кафедры засталіся В. С. Ямелін, У. А. Кулажанка, А. Г. Сімашчанка. Неўзабаве яны абаранілі кандыдацкія дысертацыі. У той жа час на кафедру прыйшоў працаваць дацэнт У. У. Максін. У 1961–1965 гг. выйшлі з друку зборнік артыкулаў «Аб эканамічных праблемах перахода ад сацыялізму да камунізму» і манаграфія дацэнта С. Я. Янчанка [7], які з 1965 па 1969 г. кіраваў кафедрай і многа зрабіў для паляпшэння падрыхтоўкі аспірантаў.

У другой палове 1960-х гг. працаваць на кафедры пасля заканчэння аспірантуры засталіся П. П. Борсук, М. І. Базылеў, Я. Б. Асіпкоў, Э. В. Шастаковіч, Т. І. Адамовіч, А. Я. Глебаў, В. Т. Цімашэнка. У той жа час з іншых ВНУ прыйшлі працаваць на кафедру дацэнты Л. М. Ілюцік, В. У. Цімашэнка, У. П. Васін, І. Д. Прахарэнка, У. К. Драчоў. Выйшлі з друку калектыўныя манаграфіі «Ад сацыялістычнай да камуністычнай эканомікі» (1966) і «Некаторыя пытанні эканамічнага развіцця Беларусі» (1969).

У кастрычніку 1969 г. кафедру палітычнай эканоміі БДУ ўзначаліў былы старшыня Дзяржплана БССР, былы рэктар БДІНГ, доктар эканамічных навук, прафесар С. М. Малінін (выпускнік БДУ 1929 г.). У 1970 г. пад яго рэдакцыяй выходзяць з друку падручнікі «Курс лекцый па палітычнай эканоміі сацыялізму», а ў 1972 г. – «Курс лекцый па палітычнай эканоміі капіталізму», падрыхтаваныя выкладчыкамі кафедры.

У 1972 г. на базе кафедры палітычнай эканоміі былі створаны кафедра палітычнай эканоміі прыродазнаўчых факультэтаў (загадчык – прафесар С. М. Малінін) і кафедра палітычнай эканоміі гуманітарных факультэтаў. На чале апошняй да 1978 г. стаяў дацэнт У. К. Драчоў, які шмат зрабіў для павышэння метадычнага ўзроўню выкладання палітэканамічнай навукі [11], за што быў узнагароджаны медалём Выставы дасягненняў народнай гаспадаркі. Ён таксама значна папоўніў прафесарска-выкладчыцкі склад, запрасіўшы працаваць спецыялістаў у канкрэтных эканамічных дысцыплінах (дацэнтаў

М. А. Жылінскага, Э. А. Юшкевіча), былых аспірантаў (А. А. Нячая, М. У. Саковіча, Н. М. Дразда) і лепшых выпускнікоў аддзялення палітычнай эканоміі БДУ (У. М. Мархонька, Н. М. Абрамаву, А. У. Вараб’ёва, М. І. Сашко, С. А. Сахацкага, Ю. І. Глыбоўскага).

У 1978 г. загадчыкам кафедры палітычнай эканоміі гуманітарных факультэтаў БДУ стаў прафесар С. Я. Янчанка, які да гэтага працаваў загадчыкам кафедры палітычнай эканоміі Мінскага педагагічнага інстытута. Ён кіраваў кафедрай амаль 10 год і за гэты час шмат зрабіў для яе ўмацавання. С. Я. Янчанка ў той час быў ужо вядомым даследчыкам палітэканоміі капіталізму. Яго працы па гэтай тэме [7–10] актуальныя і сёння.

Кафедру палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў з 1972 па 1975 г. узначальваў прафесар І. Д. Прахарэнка, а затым доўгі час, з 1975 па 1991 г., прафесар М. І. Базылеў. Ён быў прыкладам навуковай прадукцыйнасці для ўсіх калег. М. І. Базылеў працаваў у БДУ каля 25 год, прыйшоўшы ва ўніверсітэт пасля абароны ў 1966 г. арыгінальнай кандыдацкай дысертацыі «Крытыка Чарнышэўскім капіталізму і буржуазнай палітэканоміі». Яго найбольш вядомая праца [11], як і канкрэтныя вынікі па даследаванні эканомікі сельскай гаспадаркі, сацыялістычнай уласнасці, унеслі значны ўклад у тагачасную эканамічную тэорыю сацыялізму. У табліцы прыведзены пералік доктарскіх дысертацый, абароненых у БДУ, па тагачасных праблемах эканомікі.

**Тэмы абароны ў БДУ доктарскіх дысертацый па эканоміцы ў 1960–80-я гг.**

**Topics of defense of doctoral dissertations in economics at the Belarusian State University in the 1960–80s**

| Год | Аўтар | Тэма |
|---|---|---|
| 1967 | З. З. Дудзіч | Выкарыстанне сацыялістычным грамадствам важнейшых эканамічных законаў |
| 1969 | І. Д. Прахарэнка | Сацыялістычныя вытворчыя зносіны і закон адпаведнасці іх вытворчым сілам |
| 1973 | С. Я. Янчанка | Узнікненне сацыялістычных вытворчых зносін |
| 1974 | У. В. Драчоў | Марксісцка-ленінская палітычная эканомія як навука і вучэбная дысцыпліна (узаемная абумоўленнасць функцый) |
| 1975 | І. І. Церашкоў | Эканамічныя асаблівасці агульнанароднай уласнасці СССР |
| 1980 | Р. Г. Аляхновіч | Народная гаспадарка Беларусі ва ўмовах Вялікай Айчыннай вайны |
| 1981 | В. А. Кулажанка | Эканамічныя ўмовы аднаўлення асноўных фондаў сельскай гаспадаркі ў аграпрамысловым комплексе |
| 1988 | М. І. Базылеў | Абагульненне вытворчасці і развіццё зносін уласнасці |
| 1989 | Л. М. Давыдзенка | Абагульненне працы і фарміраванне працаўніка-гаспадара ва ўмовах разнастайнасці форм аграпрамысловай вытворчасці |

У пачатку 1990-х гг. з атрыманнем незалежнасці і пераходам да рыначнай эканомікі абавязковыя для вывучэння ўсімі студэнтамі дысцыпліны «Палітэканомія капіталізму» і «Палітэканомія сацыялізму», якія выкладаліся з марксісцкага пункту гледжання, былі заменены на эканамічную тэорыю, што была скапіравана з рыначных макра- і мікраэканомікі.

Былі зменены назвы кафедр, а таксама іх загадчыкі. Кафедра палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў была перайменавана ў 1991 г. у кафедру эканамічнай тэорыі, загадчыкам якой да яе ліквідацыі ў 2018 г. быў У. Л. Клюня. Ён, абараніўшы ў 2000 г. доктарскую дысертацыю «Эканамічныя праблемы развіцця аграпрамысловага комплексу ва ўмовах пераходнай эканомікі», заклаў асновы беларускай мадэлі станаўлення сельскай і рэгіянальнай рыначнай гаспадаркі [12; 13] і падрыхтаваў для вышэйшых навучальных устаноў краіны 12 кандыдатаў навук. Шмат зрабіў У. Л. Клюня пры падрыхтоўцы серыі падручнікаў для студэнтаў прыродазнаўчах факультэтаў па асновах эканамічнай тэорыі [14].

Кафедра палітэканоміі гуманітарных факультэтаў была перайменавана у кафедру эканамічных навук. Яе загадчыкам з 1991 па 1997 г. быў выпускнік аддзялення палітэканоміі БДУ 1972 г. прафесар Л. М. Давыдзенка. Пад яго кіраўніцтвам была падрыхтавана калектыўная манаграфія «Дзяржаўнае рэгуляванне сацыяльна-эканамічных зносін», дзе былі намечаны контуры беларускай мадэлі рыначнай эканомікі, вывучаны праблемы фарміравання прадпрымальніцтва і станаўлення гаспадара-ўласніка. Л. М. Давыдзенка дэталёва вывучаў новыя ўмовы вытворчасці [15].

## Роля аддзялення палітэканоміі БДУ ў эканамічнай адукацыі

Ва ўсіх вышэйшых навучальных установах краіны пры сацыялізме выкладалася палітэканомія, што патрабавала працы значнай колькасці выкладчыкаў. Такіх спецыялістаў не рыхтавалі ў краіне. У выніку гэтага на кафедрах вышэйшых навучальных устаноў працавалі не эканамісты, а працэнт выкладчыкаў з вучонай ступенню быў нізкім. Гэта сітуацыя стала прычынай таго, што ў 1950/51 навучальным годзе кафедра палітэканоміі БДУ была раскрытыкавана спачатку Міністэрствам вышэйшай адукацыі СССР, а потым і ўдзельнікамі Усебеларускай нарады загадчыкаў кафедр грамадскіх дысцыплін. У гэты час выконваючы абавязкі загадчыка кафедры З. З. Дудзіч упершыню ставіць пытанне пра неабходнасць падрыхтоўкі ў БДУ спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй па палітэканоміі і звяртае ўвагу на тое, што ўніверсітэцкая адукацыя не ведае дастаткова трывалай асновы для аспірантуры па палітычнай эканоміі. Нарэшце праз 15 год, у 1966 г., па ініцыятыве тагачаснага загадчыка кафедры С. Я. Янчанка адкрываецца аддзяленне палітэканоміі пры юрыдычным факультэце з наборам 25 студэнтаў. Галоўная мэта аддзялення – падрыхтоўка выкладчыкаў палітэканоміі для ўсіх вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі.

Невялікая колькасць выпускнікоў (першы выпуск адбыўся ў 1971 г.) рабіла палітэканамічную адукацыю элітарнай, а выпускнікоў – запатрабаванымі не толькі ў навучальных установах, але і ў навукова-даследчых інстытутах эканамічнага профілю.

Вучэбны план аддзялення палітэканоміі быў дастаткова прагрэсіўным, характарызаваўся марксісцка-ленінскім разуменнем эканомікі і пры гэтам змяшчаў курсы па гісторыі эканамічнай думкі, матэматычнай эканоміцы, тэорыі фінансаў. З 1972 па 1978 г. вучэбным працэсам аддзялення палітэканоміі кіраваў У. К. Драчоў – выпускнік аддзялення палітэканоміі Ленінградскага ўніверсітэта. Доктарскую дысертацыю ён абараніў у БДУ ў 1977 г. Прафесар У. К. Драчоў шмат зрабіў для станаўлення высокага ўзроўню адукацыі на аддзяленні палітэканоміі, якое ў 1972 г. было пераведзена на гістарычны факультэт.

Аддзяленне палітычнай эканоміі за 1966–1999 гг. выпусціла 869 спецыялістаў з вышэйшай эканамічнай адукацыяй, з іх 135 – для краін Еўропы, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі, 11 – для краін Балтыі, 49 – для рэспублік СССР. Дзякуючы якаснай эканамічнай адукацыі большасць з іх занялі высокія пасады ў сваіх краінах, напрыклад выпускнік 1982 г. Андрэас Фельске стаў выканаўчым дырэктарам кампаніі «Шэба Экспарт-Імпарт» у Германіі, выпускнік 1983 г. Сомбункхан Чыанг быў сакратаром Цэнтральнага камітэта Народна-рэвалюцыйнай партыі Лаоса ў 1957–2014 гг., выпускнік 1990 г. Фан Ван Тхан з'яўляецца дырэктарам прадстаўніцтва Банка знешняга гандлю В'етнама ў Маскве. Зразумела, найбольшы ўклад выпускнікі аддзялення палітычнай эканоміі ўнеслі ў развіццё беларускай эканамічнай навукі, адукацыі, фінансавага і рэальнага сектараў эканомікі. Сярод іх старшыня Камітэта па каштоўным паперам пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь у 1946–2005 гг. В. М. Шухно (выпускнік 1973 г.); генеральны дырэктар кампаніі «БелІндзяржстрах» А. К. Хамякоў (выпускнік 1976 г.); старшыня праўлення банка «БелВЭБ», а ў мінулым – першы намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь В. С. Мацюшэўскі (выпускнік 1991 г.); дактары эканамічных навук, прафесары Л. М. Давыдзенка і Г. Г. Санько (выпускнікі 1972 г.), Ю. І. Енін (выпускнік 1974 г.), І. У. Новікава (выпускніца 1976 г.); У. В. Пузікаў (выпускнік 1976 г.), У. А. Вараб'ёў (выпускнік 1978 г.), Л. М. Пятроўская (выпускніца 1980 г.), А. У. Данільчанка (выпускнік 1981 г., зараз дэкан факультэта маркетынга, менеджмента і прадпрымальніцтва Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта), П. С. Лямешчанка (выпускнік 1981 г.), Г. А. Прымачонак (выпускнік 1983 г.), С. Ю. Саладоўнікаў (выпускнік 1983 г.), С. В. Лукін (выпускнік 1984 г.), В. Н. Усоскі (выпускнік 1986 г.), Е. Л. Давыдзенка (выпускнік 1992 г.). Паспяхова прадстаўляюць нашу краіну за межамі, працуючы ў Германіі, Велікабрытаніі, ЗША, А. М. Коўзік (выпускнік 1981 г.), Е. Г. Каштанава (выпускніца 1991 г.), А. Г. Несвятайлаў (выпускнік 1998 г.) і інш.

Пераход да рыначнай эканомікі выклікаў неабходнаць цалкам пераарыентаваць выкладанне. Пад кіраўніцтвам новага загадчыка кафедры эканамічных навук Л. М. Давыдзенка быў здзейснены пераход аддзялення палітэканоміі на новыя, адэкватныя замежным, адукацыйныя стандарты навучання, а само аддзяленне пачало называцца аддзяленнем эканамічнай тэорыі. Яго асноўная мэта – падрыхтоўка выкладчыкаў для вышэйшых навучальных устаноў краіны па новай дысцыпліне «Эканамічная тэорыя», якая адпавядае міжнароднаму курсу *Economics*.

Спецыяльнасць карысталася вялікім попытам, а выпускнікі аддзялення былі запатрабаваны не толькі ў вышэйшых навучальных установах, але і ў міністэрствах эканамічнага профілю, банках, буйным бізнесе.

У выніку быў зроблены першы крок да адраджэння паўнавартаснай эканамічнай адукацыі і намаганнямі прафесараў А. І. Зелянкова і Л. М. Давыдзенка ў 1991 г. быў адкрыты філасофска-эканамічны факультэт, на якім у 1995 г. з'явілася новая спецыяльнасць «Эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай».

Засваеннем новых дысцыплін тэорыі рыначнай эканомікі займаліся маладыя дацэнты В. М. Шухно, А. М. Коўзік (працуе ў ЗША), А. У. Каваленак, С. А. Бародзіч (працуе ў ЗША), І. А. Лаўрухіна, Е. Г. Каштанава (працуе ў Германіі), Ю. І. Юшко, Е. Э. Васільева і старшыя выкладчыкі А. Ю. Кудзін, М. Ю. Чэпікаў.

З 1997 г. і па цяперашні час кафедру эканамічных навук, якая ў 2019 г. стала кафедрай міжнароднай палітэканоміі, узначальвае П. С. Лямешчанка. Ён прыклаў шмат намаганняў, каб выкладанне на кафедры адпавядала сучаснай палітэканамічнай адукацыі, пасля таго як у 2005 г. абараніў у Маскоўскім дзяржаўным універсітэце доктарскую дысертацыю «Развіццё прадмета і метадалогіі эканамічнай навукі ў кантэксце сучасных інстытуцыянальных змен».

## Эканамічны факультэт БДУ – лідар айчыннай класічнай эканамічнай адукацыі

Эканамічны факультэт, створаны 1 сакавіка 1999 г., працягнуў традыцыю даваць эканамічную адукацыю высокага класа, распачатую ў першыя дзесяць год работы БДУ. Факультэт створаны на базе эканамічнага аддзялення філасофска-эканамічнага факультэта, на якім рыхтавалі студэнтаў па спецыяльнасцях «Эканамічная тэорыя» і «Эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай».

Дэканам факультэта стаў М. М. Кавалёў – спецыяліст у галіне матэматычных метадаў эканомікі, які да гэтага 30 год працаваў на факультэце прыкладной матэматыкі і ў 1970-я гг. чытаў курс «Матэматычная эканоміка» для першых студэнтаў аддзялення палітэканоміі.

Пасля адкрыцця факультэта ўжо з верасня 1999 г. пачалася падрыхтоўка спецыялістаў па трох новых спецыяльнасцях: «Эканоміка», «Менеджмент» і «Фінасы і крэдыт», а з 2012 г. да іх далучылася «Эканамічная інфарматыка».

У БДУ ўпершыню ў краіне пачалі рыхтаваць спецыялістаў па прынцыпова новай для краіны спецыяльнасці «Эканоміка» з прысваеннем кваліфікацыі «Эканаміст-аналітык». Доўгі час народная гаспадарка незалежнай Беларусі мела вострую патрэбу ў такіх спецыялістах.

Вельмі хутка колькасць студэнтаў новага факультэта ўзрасла да 1200 чалавек. Асноўная ідэя, закладзеная дэканам М. М. Кавалёвым у канцэпцыю стварэння факультэта, выяўлялася ў дэвізе «Элітны факультэт для эліты». Таму колькасць студэнтаў, якія навучаліся за кошт дзяржаўнага бюджэту, была невялікай (каля 60), платных месцаў было больш, кошт навучання быў высокім – элітная адукацыя патрабавала затрат. У верасні 1999 г. была створана новая кафедра эканамічнай інфарматыкі і матэматычнай эканомікі, на базе якой пазней узніклі кафедра аналітычнай эканомікі і кафедра эканаметрыкі і эканамічнай інфарматыкі (у 2020 г. апошняя была перайменавана ў кафедру лічбавай эканомікі). У той жа час пачала працаваць кафедра банкаўскай і фінансавай эканомікі (у 2013 г. яе падзялілі на кафедру банкаўскай эканомікі і кафедру карпаратыўных фінансаў).

У сувязі з 80-годдзем БДУ ў 2001 г. дэкану эканамічнага факультэта М. М. Кавалёву было прысвоена ганаровае званне «Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь».

У 2000 г. у якасці эксперымента эканамічны факультэт першым у БДУ перайшоў на двухузроўневую сістэму падрыхтоўкі спецыялістаў (бакалаўрыат і магістратура), у рамках якой у 2003–2007 гг. рэалізоўваў праект *TEMPUS* з дапамогай Універсітэта імя Ота фон Герыке (Германія), Трэнцкага ўніверсітэта (Італія), Малагскага ўніверсітэта (Іспанія) і быў піянерам у БДУ па ўкараненні крэдытна-модульнай сістэмы з пералікам прадмета-гадзін у крэдыта-модулі.

Магістратура эканамічнага факультэта БДУ карысталася вялікай папулярнасцю сярод работнікаў банкаў і фірм. У выніку за 10 год (з 2001 г.) ступень магістра эканомікі атрымалі больш за 1000 беларускіх навучэнцаў, а потым да іх масава далучыліся замежныя, і колькасць падрыхтаваных для Кітая і іншых краін магістраў эканамічных навук таксама наблізілася да 1000 чалавек. Попыт на магістарскія спецыяльнасці па напрамках «Аналітычная эканоміка і бізнес-аналітыка», «Лічбавая эканоміка» застаецца вялікім і сёння. У 2016 г. сумесна з Універсітэтам прыкладных навук г. Мітвайда (Германія) была распачата падрыхтоўка магістраў па праграме *Industrial management* з выдачай дыпломаў БДУ і нямецкага партнёра.

Усё гэта дазволіла выпускнікам эканамічнага факультэта БДУ быць запатрабаванымі спецыялістамі, з лёгкасцю знаходзіць цікавую і перспектыўную працу ў рэспубліцы і за яе межамі.

Спынімся на важнейшых напрамках і выніках навуковых даследаванняў вучоных эканамічнага факультэта.

Першы напрамак – распрацоўка праблем палітычнай эканоміі і інстытуцыянальнай эканомікі, значны ўклад за гады існавання факультэта сюды ўнеслі прафесары П. С. Лямешчанка, В. Ф. Байнёў, С. У. Лукін і іх вучні. Так, яны істотна пашырылі катэгарыяльны апарат сучаснай інстытуцыянальнай тэорыі (П. С. Лямешчанка, Ю. В. Валевіч, І. А. Рудзянкоў), раскрылі інстытуцыяльны змест ключавых катэгорый рынка з улікам іерархіі складзеных каштоўнасцей і ступеней даверу (П. С. Лямешчанка [16]), зрабілі значны ўнёсак у вывучэнне ролі «інстытуцыянальнага і сацыяльнага капіталу» (П. С. Лямешчанка, А. У. Вараб’ёў, С. А. Сысоеў), выканалі прыкладны аналіз працэсу інстытуцыялізацыі, у выніку чаго выявілі такія новыя характарыстыкі паняцця «пераходны перыяд», як інстытуцыянальная нераўнавага, трансфармацыйная рэнта і інш. (П. С. Лямешчанка, Ю. В. Валевіч), заклалі падмурак аналізу праблем

глабальнай палітэканоміі (П. С. Лямешчанка, І. А. Лаўрухіна [17]), а таксама вывучылі значэнне нефармальных інстытутаў і ментальнасці насельніцтва (П. С. Лямешчанка, А. М. Сідарава [18]).

Цікавыя вынікі па прымяненні балансавых мадэлей Лявонцьева да вылучэння трансфармацыі эканамічнай сістэмы Беларусі атрымаў А. І. Караткевіч [19]. Прафесар С. В. Лукін даследаваў ролю рэлігійных інстытутаў у эканоміцы [20], а прафесар М. М. Кавалёў з сааўтарамі прапанавалі новыя метады кіравання дзяржаўным сектарам эканомікі ў цэлым і карпаратыўнага кіравання прадпрыемствамі, а таксама вылучылі функцыі банкаў развіцця ў гэтым працэсе [21; 22].

Другі актуальны і сучасны напрамак даследаванняў на эканамічным факультэце звязаны з распрацоўкай праблем аптымізацыі эканамічных працэсаў, фінансавай інжынерыі і лічбавай эканомікі. Шэраг знакамітых навукоўцаў-матэматыкаў, што сталі эканамістамі і працуюць на кафедры аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі, развіваюць тэорыю прыняцця аптымальных рашэнняў у эканоміцы з дапамогай гібрыдных інструментаў мадэліравання эканамічных працэсаў. Даследчыкі выпрацавалі прынцыпова новыя падыходы да апісання шматгранніка лінейных парадкаў (*voting polytope*) і шматгранніка цыклаў, якія дазволілі прапанаваць эфектыўныя метады аптымізацыі працэсаў. Атрыманыя вынікі былі паспяхова ўжыты на практыцы для складання методык рэйтынгаў банкаў, універсітэтаў, ранжыравання тэндарных заявак, выбару аптымальнага парка абсталявання, а таксама доўгатэрміновага прагназавання эканамічнага росту (М. М. Кавелёў, К. Г. Гаспадарык [23; 24]).

Ствараецца матэматычная тэорыя транспартнай лагістыкі (А. А. Дуціна, Г. А. Каралёва [25–26]), у аснове якой – новыя мадэлі і метады пошуку аптымальных патокаў у сетках са складанымі абмежаваннямі, што мадэлююцца субмадулярнымі функцыямі, і дробна-інтэгральныя абагульненні класічнай транспартнай задачы Монжа-Канторовіча, прапанаваны таксама новыя эканамічныя падыходы да прагназавання экспарту транспартных паслуг.

У маі 2005 г. на эканамічным факультэце была праведзена XVIII еўрапейская канферэнцыя *ECCO–XVIII* «Камбінаторная аптымізацыя для сучаснай вытворчасці, лагістыкі і ланцужкоў паставак», а ў 2010 г. – XIX міжнародны кангрэс *AEDEM 2010* «Global financial & business networks and informational management systems» (сумесна з Еўрапейскай акадэміяй менеджмента і бізнесу). Таксама актыўна вядуцца распрацоўкі ў галіне аналітычных рашэнняў: вядомыя матэматыкі С. В. Рагозін, М. В. Дубатоўская, Г. А. Каралёва апублікавалі шэраг манаграфій і артыкулаў у прэстыжных замежных часопісах, а С. В. Рагозін у 2014–2018 гг. быў каардынатарам ад БДУ навуковага праекта па Еўрапейскай рамачнай праграме *TAMER*. Ён разам з матэматычным факультэтам БДУ арганізуе раз на тры гады міжнародную канферэнцыю па аналітычных метадах *AMADE*.

Маштабны навуковы напрамак – лічбавая глабалізацыя і праблемы аптымальнай інтэграцыі эканомікі Рэспублікі Беларусь у сусветную эканоміку – вывучае М. М. Кавалёў разам са сваімі дактарантамі Г. Г. Галавенчык і К. Г. Гаспадарык, якія шмат зрабілі для распрацоўкі новых матэматычных мадэлей доўгачасовага прагназіравання эканамічнага развіцця ва ўмовах лічбавай глабалізацыі і прапанавалі шляхі рашэння актуальных праблем лічбавай палітыкі. Ствараюцца сучасныя мадэлі міжнароднай эканомікі – тэорыя аптымальных валютных зон, мадэлі (тыпу Лявонцьева) знешнегандлёвага абмену, мадэлі ўплыву лічбавай глабалізацыі на рост, эканаметрычныя абагульненні гравітацыйнай мадэлі гандлю. Глыбокае вывучэнне пытанняў глабалізацыі і рэгіяналізацыі, распрацоўка новых метадаў маніторынгу і прагнозу знешнегандлёвых і інвестыцыйных патокаў, тэорый рэйтынгу і канкурэнтаздольнасці дзяржаў і рэгіёнаў дазволілі вырашаць шэраг навукова-практычных праблем у інтарэсах народнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь. У прыватнасці, навукоўцы факультэта распрацавалі многія аспекты праблемы развіцця экспартнага патэнцыялу Рэспублікі Беларусь, напрыклад у 2000 г. прафесар М. М. Кавалёў завяршыў распрацоўку Нацыянальнай праграмы развіцця экспарту Рэспублікі Беларусь на 2000–2005 гады (першы яе варыянт быў прапанаваны Інстытутам эканомікі НАН Беларусі), а потым доўгі час працаваў у Камісіі па эканамічнай бяспецы Дзяржаўнага сакратарыята бяспекі Рэспублікі Беларусь.

